№№49—50
(2569—2570)

29 сакавіка 2007 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

Да ўвагі!
Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб КОЛАС

Шаноўныя чытачы!

Па пытаннях распаўсюджвання газеты жыхары сталіцы могуць звяртацца па тэлефоне 206-63-93, усе астатнія — па тэлефоне 206-68-71.

СПЕЦЫЯЛЬНЫ РЭПАРТАЖ

Дзень Волі-2007

Вольнаму — воля...

Дзень Волі кожны адзначаў па-свойму — хтосьці выйшаў на вуліцу пад бел-чырвона-белым сцягам, камусьці давялося слухаць поп-артыстаў на наладжаным уладамі і БРСМам канцэрце, а нехта проста вырашыў адсядзецца дома.

Напярэдадні

Яшчэ зранку 25 сакавіка Кастрычніцкая плошча беларускай сталіцы была заблакіравана міліцыяй, супрацоўнікамі ДАІ і "таптунамі" ў цывільным. Дзяжурылі "аўтазакі", было зразумела, што людзям проста так да плошчы не падысці.

Вуліцы Энгельса і Леніна таксама перагарадзілі супрацоўнікі міліцыі; уздоўж Энгельса расцягнуліся дзевяць аўтобусаў з завешанымі вокнамі. Менавіта ў такіх звычайна чакаюць "работы" і "кліентаў" каманды спецназаўцаў.

Прыпаркавацца ў самым цэнтры Мінска раніцай у нядзелю было проста немагчыма — даішнікі паўсюль панаставілі адпаведныя знакі. Складвалася ўражанне, што ў цэнтры беларускай сталіцы ўведзена ваеннае становішча. Не працавалі крамы і кавярні, якія месцяцца ля Кастрычніцкай плошчы, быў зачынены "Макдональдс". Людзей, што набылі квіткі, каб паглядзець "Лебядзінае возера", паказ якога быў запланаваны на раніцу 25 сакавіка, разварочвалі далёка ад падыходаў да Палаца рэспублікі. Дабірацца да месца людзі павінны былі ў абыход.

Нашы спробы прайсці ў 11.40 бліжэй да плошчы таксама аказаліся безвыніковымі. На скрыжаванні вуліц Леніна і Карла Маркса — міліцэйскі кардон. Тлумачым, што мы, як і міліцыянеры, знаходзімся на працы. *"Не положено, проход закрыт*, — тлумачыць нам у адказ "старшы". — *Мы имеем право пропускать в сторону площади граждан только с пропусками трех категорий". — "Прадстаўцеся, калі ласка". — "Для вас я просто подполковник". — "А як жа Закон аб міліцыі, дзе сказана, што супрацоўнікі праваахоўных органаў павінны прадстаўляцца?"* Падпалкоўнік неахвотна дастае з-за пазухі пасведчанне (падпалкоўнік Пётр Уладзіміравіч Лапаціка), а затым звязваецца з кімсьці па рацыі: *"Здесь журналисты из "Народной воли". Пропускать?" "Вяжи их"*, — чуецца ў рацыі...

"Вязаць" нас ніхто не стаў, аднак і прайсці не далі.

Цырк не працаваў, але клоуны засталіся

...Давялося *"рабіць каўбасу"* з выхадам аж да Белдзяржцырка. Тут дэманстрантаў набралося некалькі тысяч. Нехта з іх прынёс расцяжку, на якой было напісана: **"Свабоду Казуліну! Свабоду палітвязням!"** Па натоўпе пайшла інфармацыя, што міліцыя не дае далучыцца да калоны астатнім, адсякаючы іх на падыходах. Сярод тых, хто сабраўся ля цырка, былі заўважаны і правакатары — жанчына з малым і стары ў чорных акулярах *"а ля агент 007"*. Яны спрабавалі справакаваць прысутных на палітычны дыспут. Прычым магчымыя палітычныя змены ў краіне малявалі па-свойму: *"Вы же когда со своими флагами к власти придете, всех нас кровью позаливаете! Хотя я тоже за независимую Беларусь!"* Прысутныя ў дыялог з імі не ўступалі, толькі раілі падысці да *"сваіх"*, паказваючы ў бок міліцыянераў, якія перагарадзілі праспект. Маўляў, яны завязуць вас да бібліятэкі ці ў аэрапорт...

Людзі выстраіліся ў калону, у натоўпе гучала "Жыве Беларусь!". Дарэчы, дэманстранты паводзілі сябе падкрэслена карэктна і святочна. Недзе на пачатку першай гадзіны спецназаўцам паступіў загад — выцясняць людзей да Акадэміі навук — дазволенага ўладамі месца збору для правядзення акцыі.

"Касманаўты бягуць!" — выкрыкнуў нехта. З аўтобусаў, якія стаялі ўздоўж вуліцы Янкі Купалы, павыскоквалі спецназаўцы сумна вядомага Паўлічэнкі на чале са сваім камандзірам. Спецназ наступаў, людзі рушылі па тратуары ў бок Акадэміі навук.

Тым часам ля "Макдональдса"...

Некаторыя людзі збіраліся і каля ГУМа, недалёка ад перакрытай плошчы. Там былі Аляксандр Мілінкевіч, Анатоль Лябедзька, многія замежныя госці і прадстаўнікі дыпламатычных місій.

Калі ля цырка народам *"кіраваў"* спецназ Паўлічэнкі, то ў другім месцы былі задзейнічаны сілы Палка спецыяльнага прызначэння (былога АМАПу). Мэта часткі дэманстрантаў, якая сабралася каля ГУМа, была злучыцца з тымі, хто знаходзіўся ля цырка. Вырашылі звярнуць на Гарадскі вал, а затым на вуліцу Інтэрнацыянальную. Праўда, прайсці ўдалося толькі 15—20 метраў — як чэрці з табакеркі з розных куткоў павысыпалі хлопцы ў чорным адзенні — спецназ, які пачаў актыўна выцясняць людзей з вуліцы, а затым акружыў групу моладзі і пачаў збіваць. Мілінкевіч кінуўся абараняць маладых людзей, але ў гэты момант спецназаўцы кінуліся на яго з жонкай і павалілі абодвух на асфальт. Людзі ў гэты час паставілі спіны, каб наогул не затапталі. Трэба сказаць, што ў гэты момант спецназаўцы і самі спынілі свае дзеянні. 3—4 секунды экс-кандыдату ў прэзідэнты хапіла, каб падняцца і пайсці далей *(падрабязнасці — у матэрыяле А.Лябедзькі.* — **Рэд.**). У рэшце рэшт калоны сустрэліся толькі ля Акадэміі навук.

Мая міліцыя мяне беражэ

Увечары 25 сакавіка па БТ расказалі пра тое, што беларускія ўлады парупіліся аб дастаўцы мітынгоўцаў да дазволенага месца правядзення акцыі. Зялёныя мазаўскія аўтобусы і сапраўды стаялі ўздоўж праспекта Незалежнасці. На іх было напісана "Заказной". Аднак садзіцца ў іх ніхто не рызыкнуў — д'ябал яго ведае, куды б завезлі...

Трэба адзначыць, што падчас шэсця калоны па праспекце многія адзначалі, што міліцыі панагналі проста процьму. Літаральна праз кожныя пяць метраў на праспекце з абодвух бакоў стаялі людзі ў міліцэйскай форме і даішнікі. Шмат было іх і ў дварах, дзе акрамя ўсяго іншага стаялі і "аўтазакі". Дзіўна, але факт: упершыню за гісторыю правядзення падобных акцый у ачапленні праспекта былі задзейнічаны нават прадстаўніцы прыгожай паловы чалавецтва ў форме.

Па праспекце калона дайшла да Акадэміі навук спакойна. Па нашых прыкідках, усяго сабралося ад 5 да 7 тысяч чалавек. Большасць людзей знаходзілася непасрэдна ля Акадэміі, нехта глядзеў *"кіно пра апазіцыю"* з супрацьлеглага боку.

Спадзяванням аматараў брутальных дзеянняў міліцыі спраўдзіцца не давялося. Мітынг, які доўжыўся крыху больш за паўтары гадзіны, прайшоў спакойна. Нягледзячы на настойлівыя просьбы міліцэйскага *"мацюгальніка"* аб тым, што ўдзельнікам акцыі належыць прайсці на плошчу Бангалор, ніхто з месца не зварухнўся. Потым міліцыянты змянілі пласцінку, і з узмацняльніка ўжо гучала: *"Вашы дзеянні супрацьзаконныя. У выпадку непадпарадкавання законным патрабаванням мілыцыі супраць вас можа быць ужыта фізічная сіла, і вы будзеце прыцягнуты да адказнасці згодна з дзеючым заканадаўствам"*. Аднак і гэта не запалохала ўдзельнікаў святкавання Дня Волі.

Мітынг

На мітынгу выступілі вядомыя ў Беларусі палітыкі і грамадскія дзеячы — Вінцук Вячорка, Аляксандр Мілінкевіч, Анатоль Лябедзька, расійскі дэпутат Уладзімір Рыжкоў, дачка экс-кандыдата ў прэзідэнты Аляксандра Казуліна — Юлія. Усе яны віншавалі беларусаў з Днём Волі, нагадвалі аб тым, што ў беларускіх турмах утрымліваюцца палітвязні, узгадвалі пра галадоўку Аляксандра Казуліна... Заклікалі прыхільнікаў перамен быць разам, што сёння для беларускай апазіцыі асабліва актуальна.

Некаторыя людзі скептычна заўважалі: *"Мілінкевіч кажа, што з кожным днём прыхільнікаў перамен становіцца ўсё больш і больш? Дык дзе яны? Дзе тысячы агэнэшнікаў і тысячы сацыял-дэмакратаў? Каб нас выйшла 50 альбо 100 тысяч, тады б з намі лічыліся. Наша апазіцыя паміж сабой дамовіцца не можа, не тое што людзей вакол сябе згуртаваць. Сумнае свята атрымалася ў чарговы раз"*.

Мітынг ля Акадэміі навук скончыўся выкананнем гімна "Магутны Божа", пасля чаго хтосьці накіраваўся дадому, а нехта вырашыў працягнуць свята ля Нацыянальнай бібліятэкі...

Замест эпілога. Разгон

Каля тысячы чалавек а 17-й гадзіне вырашылі ўсё ж такі рушыць у бок Нацыянальнай бібліятэкі, дзе адбываўся "правільны" канцэрт. Хутчэй за ўсё па рацыі ад гэтым перадалі, бо ля плошчы Калініна дэманстрантаў заблакіравала міліцыя, а калі моладзь прыйшла да бібліятэкі, аказалася, што мерапрыемства ўжо скончана.

Між тым на месцы заставаліся гандляры, некаторыя слухачы і чалавек трыццаць байцоў Палка спецыяльнага прызначэння. Народ паставіў сцягі і пачаў скандіраваць: "Жыве Беларусь!". І "Агурбаш! Агурбаш!"

Замест Агурбаш з-за бібліятэкі вываліла яшчэ чалавек 300 спецназаўцаў, а побач са сцэнай пачалі недвухсэнсоўна рухацца дзве машыны з брандспойтамі (маўляў, хутка трэба сцэну мыць).

Калі сілавікі прыступілі да больш актыўных дзеянняў, моладзь разбеглася хто куды. Святкаванне скончылася...

Віталь ГАРБУЗАЎ.
Алесь СВЯТЛАНІЧ.
Фота Юрыя ДЗЯДЗІНКІНА.

Запалонены Багдановіч

Фантазіі творцаў сцэнарыя "Як спаганіць свята" не было межаў! Разбіць цэнтр сталіцы на загоны-пасткі для грамадзян, якія меліся ўрачыста адзначыць Дзень Волі на плошчы Кастуся Каліноўскага (афіцыйная назва — Кастрычніцкая), ім паказалася мала. Дазнаўшыся пра "злачынны" намер сяброў і прыхільнікаў Кансерватыўна-Хрысціянскай партыі ўшанаваць у гэты дзень памяць найславутых сыноў Бацькаўшчыны, што паклалі жыццё і талент дзеля яе незалежнасці і Адраджэння, вырашылі: не дапусціць! Помнік Максіму Багдановічу, да якога ішлі людзі з кветкамі, аказаўся забарыкадзіраваны спарудай з аўтобусаў. Так што, каб ускласці кветкі, давялося амаль што прапаўзаць між коламі машын...

Манумент у палоне — нешта новенькае, здаецца, яшчэ не вядомае чалавецтву. Так бы мовіць, беларускае ноу-хау-2007. Трэба, трэба яго запатэнтаваць! А вось адна бліскучая магчымасць трапіць у Кнігу рэкордаў Гінеса засталася, на жаль, упушчанай. Ну як жа было не датумкаць сцэнарыстам: падняць бы ў паветра над Мінскам усяго якую сотню-другую верталётаў з чорнымі палотнішчамі-расцяжкамі — і сонца, што так шчодра і ветла ўсміхалася гараджанам, было б закрыта рукатворнай хмарай, а настрой "нацыяналістам" літаральна азмрочаны...

Але не ўсё падуладна нават самым вынаходлівым майстрам мудрагелістых сюжэтаў. Тыя, што сабраліся крыху воддаль Багдановічава помніка, гаварылі аб нязгасным прыкладзе для сённяшняга і будучых пакаленняў самаахвярных змагароў за Нацыянальную ідэю, пабудову светлага, прыгожага Беларускага дома, адкрытага ўсім добрым людзям.

— Сённяшняя ўлада хацела б бачыць нас маўклівымі рабамі, загнаць нас, як звяроў, у клеткі і аўтазакі. Але ўжо не атрымаецца, — сказаў адзін з кіраўнікоў КХП—БНФ Сяргей Папкоў. Яго паплечнік Валеры Буйвал зачытвае віншаванне землякам са святам ад Зянона Пазьняка.

Да грамады ля Опернага тэатра далучаецца гурма маладзёнаў — яны толькі што прарвалі аблогу на праспекце Пераможцаў ля кінатэатра "Масква" (да чаго ж "горда" гучаць у гэтым кантэксце гучныя назвы!). Юная чароўная дзяўчына, студэнтка аднаго з тэхнічных ВНУ сталіцы, распавяла:

— Некалькі нашых факультэтаў сёння пад страхам смерці *(так яна і сказала, хаця гэта, зразумела, метафара.* — **Рэд.**) пагналі на канцэрт, што зладзілі афіцыйныя ўлады ў Аэрапорце-1. Мы ж з сябрамі ўсё роўна тое слухаць не збіраемся, любім сапраўдную музыку, цяжкі рок, фальклор. Самі хацелі паказаць на свяце тэатралізаваны старажытны абрад веснавога абуджэння прыроды. Ды, як бачыце, не выпадае, а днямі пакажам.

Двое вясёлых хлопцаў са смехам узгадвалі нядаўнюю прыгоду:

— Бачым, абступаюць фігуры ў чорных масках — аднак нейкія смешныя, шчуплыя. Здагадваемся — дзяўчаты! Магчыма, курсанткі з міліцэйскай акадэміі, іх там, чулі, пасылаюць на "абкатку". Дык мы самі да іх — з абдымкамі, жартамі, кажам: "Кідайце, даражэнькія, дурноту, давайце з намі на мітынг, а потым — у кіно!" І тут яны ад нас — далей, далей...

Што ж, на шчасце і радасць, падымаецца новая генерацыя маладых, адважных, аптымістычных каліноўцаў, і іх ужо не запалохаць, не спыніць. *"Гэта мы, маладыя грамадзяне Беларусі, якія любяць сваю Радзіму, якія ўпэўнены ў тым, што беларускі народ варты лепшага жыцця... заяўляем: ніхто, акрамя цябе, не зменіць сітуацыю ў Беларусі*, — чытаю ў іхняй улётцы, так не падобнай на "стара-апазіцыйную" — млявую, няўцямную, закінутую ў маю паштовую скрыню. — *Нам патрэбен ТЫ! Беларусь — твой дом... Далучайся да неўвалтоўнага супраціву. Змагайся за волю Бацькаўшчыны!"*

І ўсмешкі на юных тварах, і чыстае, яркае неба насуперак усяму стваралі настрой, які з верай у будучыню выказаў наш несмяротны Максім — запалонены, але жывы і вольны духам.

Ты не згаснеш,
ясная заранічка,
Ты яшчэ асвеціш родны край.
Беларусь мая! Краіна-бранячка!
Устань, свабодны шлях
сабе шукай!

Святлана КЛІМЕНЦЕНКА.

АД РЭДАКЦЫІ

Аўтар не сказала пра самае галоўнае: колькі людзей прыйшло да помніка Багдановічу?

А прыйшла ўсяго невялічкая група сябраў і прыхільнікаў Кансерватыўна-Хрысціянскай партыі. І гэта сіла? І гэта партыя? Што скажаце, спадары Пазьняк, Беленькі, Папкоў?

Можна колькі хочаш крытыкаваць улады, але толку будзе мала, калі аб'ектыўна не паглядзець на сваю работу. Гэта тычыцца не толькі кіраўніцтва Кансерватыўна-Хрысціянскай партыі...

Гуляць дык гуляць!

Трэба аддаць належнае Беларускаму рэспубліканскаму саюзу моладзі, які вырашыў разам са сталічнымі ўладамі таксама годна адзначыць Дзень Волі.

Напярэдадні "правільная" моладзь недзе з тыдзень круціла на тэлебачанні і ў грамадскім транспарце рэкламныя ролікі з абвесткай аб тым, што 25 сакавіка на пляцоўцы аэрапорта "Мінск-1" і ля Нацыянальнай бібліятэкі БРСМ разам з Мінгарвыканкамам праводзіць акцыю "За незалежную Беларусь!". Акцыя, так бы мовіць, дабрачынная (незалежнасць, маўляў, не прадаецца), уваход бясплатны.

Зрэшты, як казаў спадар Чарнамырдзін, хацелі як лепш — атрымалася, як заўсёды. У плане таго, што традыцыйныя "масавыя гулянні" зноў ператварыліся ў фарс.

Безумоўна, былі і такія, хто сам па сабе вырашыў схадзіць у выхадны дзень на "халяўны" канцэрт, аднак у асноўным маладых людзей дастаўлялі на "месца" арганізаванымі групамі ў добраахвотна-прымусовым парадку. У парку перад аэрапортам некаторым даводзілася нават адзначацца ў спісах, пасля чаго многія з чыстым сумленнем накіроўваліся дадому.

Артыстаў таксама разбілі на дзве часткі. У аэрапорце публіку весялілі Жанет, Іна Афанасьева, Вікторыя Алешка, Руслан Аляхно, ля Нацыянальнай бібліятэкі спявалі Паліна Смолава, "Песняры", Рыгор Калдун ды іншыя.

Кажуць, што артыстам плацілі (у гэтым сэнсе незалежнасць, аказваецца, ні пры чым), некаторыя наогул адмовіліся выступаць на вышэйназваных гулянках.

"Мы — за сильную, процветающую и независимую Беларусь! — падзадорвалі слухачоў артысты. — Не дадим никому в обиду нашу страну! Защитим наши границы!"

Што да чаго — ніхто так і не зразумеў. Як, напэўна, не зразумелі прыйшоўшыя і тое, якое свята яны сёння, уласна кажучы, адзначаюць. Адным словам — поп-культура...

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

Поп-культура... (На сцэне ля Нацыянальнай бібліятэкі.)

Фота photo.bymedia.net

Ангела МЕРКЕЛЬ: «Еўропа з вамі!»

Беларуская тэматыка знайшла сваё адлюстраванне ў выступленні канцлера ФРГ Ангелы Меркель на святочным пасяджэнні кіраўнікоў дзяржаў — удзельніц Еўрапейскага Саюза ў гонар 50-годдзя стварэння ЕС, якое супала з беларускім Днём Волі і праходзіла ў Берліне.

"Святкаванне 50-годдзя заключэння Рымскіх дагавораў дае вялікую надзею тым, хто не хоча мірыцца з несправядлівасцю свету, — заявіла Ангела Меркель. — *Апрача таго, гэта і вялікая надзея для тых еўрапейцаў, якія дагэтуль змушаны пакутаваць ва ўмовах удушэння свабод, — як беларусы. Сёння яны адзначаюць Дзень незалежнасці. Сёння мы думаем і пра іх таксама і звяртаемся да іх: правы і свабоды неад'емныя! Еўропа з вамі!"*

Ул.інф.

Скрабец супраць Ціцянкова

Дэпутат Палаты прадстаўнікоў папярэдняга склікання **Сяргей СКРАБЕЦ** звярнуўся ў суд Першамайскага раёна Мінска. Ён абвінавачвае намесніка старшыні сталічнага гарвыканкама **Міхаіла ЦІЦЯНКОВА** ў хлусні і нядбайным выкананні абавязкаў.

Сяргей Скрабец падаваў заяўку на правядзенне 16 сакавіка ў парку Дружбы народаў мітынгу і рок-канцэрта ў абарону правоў вязняў і іхніх сем'яў. Скрабцу адмовілі. У афіцыйным адказе, які падпісаў Міхаіл Ціцянкоў, адмову абгрунтавалі *"правядзеннем у гэты дзень запланаваных загадзя мерапрыемстваў па прыбіранні і рамонце паркавага абсталявання"*. Аднак экс-парламентарый са спасылкай на восем сведак сцвярджае, што ў той дзень ніякіх работ у парку не праводзілі.

Ул.інф.

САЛІДАРНАСЦЬ

Вызваліць Казуліна!

Польская грамадская арганізацыя "Свабодная Беларусь" заявіла пра завяршэнне акцыі збору подпісаў з патрабаваннем да беларускіх улад вызваліць экс-кандыдата ў прэзідэнты Аляксандра Казуліна. Сабрана 7140 подпісаў.

"Мы перададзім гэтыя подпісы фармальным шляхам. У Варшаве ёсць прадстаўніцтва афіцыйнага Мінска — амбасада, і туды мы накіруем зварот. Канешне, мы разумеем, что беларускі рэжым не надта зверне ўвагу на гэтыя некалькі тысячаў подпісаў, але лічым, што гэта наш абавязак — паказваць сваю салідарнасць", — сказаў Радыё Свабода адзін з лідэраў арганізацыі Куба Міхалоўскі.

ад 25 сакавіка – новыя частоты, хвалі

06:00-08:00	7115 9635	41 м 31 м
18:00-20:00	9725 15215	31 м 19 м
20:00-22:00	7115 15215	41 м 19 м
22:00-24:00	7115 9750	41 м 31 м

612kHz/490м сярэднія хвалі

радыё свабода
Тэл. (017) 266 39 52
СМС 391 22 24
svaboda@rferl.org
п/с 111, Менск, 220005, Беларусь
Vinohradska 1, Praha 11000 CZ

www.svaboda.org

Народная Воля http://www.nv-online.info
29 САКАВІКА 2007 г.

ЭКСПЕРТИЗА

Олег ВОЛЧЕК:

«В Беларуси во время президентских выборов действовали незаконные спецподразделения для саботирования и срыва предвыборной кампании»

23 марта 2007 года руководитель юридической службы А.Козулина Олег Волчек подал жалобу прокурору Ленинского района г.Минска А.К.Стуку. В жалобе О.Волчек просит отменить постановление следователя Г.В.Поцейковича об отказе в возбуждении уголовного дела в отношении сотрудников ОМОНа А.Н.Якимовича, В.А.Гаевского, П.Н.Щербакова и инспекторов концертного зала "Минск" И.А.Салженикина, С.А.Вачинского. Указанные лица 17.02.2006 года незаконно препятствовали кандидату в президенты А.Козулину пройти в Национальный пресс-центр. В результате Олегу Волчеку были причинены телесные повреждения — химический ожог глаза и побои в области рук. Жалоба правозащитника составила 44 страницы, вместе с ней были приложены видео и фотоматериалы. Наш корреспондент задала несколько вопросов Олегу Волчеку по поводу этой жалобы.

— Олег, Ваша жалоба касается событий, происшедших 17 февраля 2006 года в Национальном пресс-центре. Скажите, можно ли верить информации анонимных сотрудников КГБ от 24 апреля 2006 года, которые распространили сведения, что провокация против А.Козулина в Национальном пресс-центре была спланирована сотрудниками ОМОНа?

— В ходе предварительного и судебного расследований по делу А.Козулина стало очевидно, что 17.02.2006 года в Национальном пресс-центре нас действительно ждала "засада" сотрудников ОМОНа в штатской одежде. Однако следствие не установило имена всех крепких парней, участвовавших в этой операции, не установило, из какой они секретной службы. Я написал заявление о возбуждении уголовного дела в отношении этой группировки за хулиганские действия. Однако старший следователь Ленинской прокуратуры Г.В.Поцейкович провел формальную проверку по моему заявлению. Им не был допрошен не только я и кандидат в президенты Республики Беларусь А.Козулин, но и сотрудники милиции, и инспекторы контроля КЗ "Минск". Все это привело к тому, что он допустил ряд ошибок и неточностей в своем постановлении.

Так, следователь пишет, что мне был поставлен диагноз травмы глаза *"хронический ожог"* вместо *"химический ожог"*. Он совершенно не вникал в материалы дела, за месяц не смог запомнить даже отчество Александра Козулина: на одной странице пишет *"Козулин Александр Владимирович"*, а на другой — *"Козулин Александр Владиславович"*.

Или еще один ляпсус, который допустил Г.В.Поцейкович, указав, что Якимович А.Н. *"...находился на излечении с 17 февраля по 2 февраля 2006 года"*. Из его ответа неясно, когда же образовалась травма у Якимовича: 2 февраля или 17 февраля и сколько дней он лечился. Так кому же верить? Следователю, утверждающему, что Якимович лечился 15 дней? Якимовичу, который говорил, что лечился с 17-го по 20 февраля? Только по этим основаниям данное постановление подлежит отмене.

— Как же можно, не вызывая заявителя по его жалобе и других очевидцев происшествия, принять решение о невиновности сотрудника ОМОНа Якимовича? Тем более, по такому общественно-значимому делу?

— Следователь, судя по всему, не опрашивал Якимовича, а использовал его показания из уголовного дела, возбужденного ГУВД Мингорисполкома по обвинению кандидата в президенты А.В.Козулина по ст. 339, 342 УК РБ. Если внимательно изучить его показания, можно прийти к выводу, что Якимович дал ложные показания против кандидата в президенты А.Козулина, чтобы избежать уголовной ответственности за свои противоправные действия.

Почему Якимович скрылся с места преступления? Если он считал себя потерпевшим в данной ситуации, то почему не стал дожидаться приезда милиции, которую я и А.Козулин вызвали? Встает другой вопрос: если я и А.Козулин хулиганили, то почему Якимович не вызвал милицию сам? Если судить по его показаниям, то Якимовичу стало плохо сразу же после удара Козулина. Так почему же он сразу, как я, получивший ожог глаза, не вызвал "скорую помощь"? Если посмотреть на фотографии, то у Якимовича под левым глазом нет какого-либо следа телесного повреждения (по материалам дела в области наружного края левой орбиты у него гематома размером 3х8 см). А также нет повреждений и под правым глазом, как показал его коллега Гаевский в своих показаниях на следствии.

— Так все же ими кто-то руководил в Национальном пресс-центре?

— Два сотрудника в штатском руководили операцией по воспрепятствованию кандидату в президенты А.Козулину провести пресс-конференцию. Эти двое мужчин также постоянно вмешивались в разговор, когда я пытался выяснить личности задержанных. Я попросил их представиться, но они отказывались назваться (позже мне стало известно, что один из них — руководитель подразделения ОМОНа, его я увидел на акции 25 марта 2006 года). Оба были запечатлены на фотоснимках, которые я передал следствию. Всего я приложил к материалам уголовного дела А.Козулина 10 фотографий, на которых и запечатлены представители неустановленной группировки. Однако следователь Поцейкович так и не установил, кто же эти крепкие парни в черной одежде. Как очевидно уже только из этих фотографий, не составляло большого труда вызвать указанных лиц и допросить их. При этом вызывает недоумение позиция одного из заместителей Ленинского РУВД г.Минска, который видел, как приехал наряд милиции, но не подошел к ним и не сказал, чтобы они задержали меня с Козулиным. Мало того, он был свидетелем, как мы усадили в патрульную машину двух парней из этой спецгруппы.

По моему мнению, именно замначальника Ленинского РУВД г.Минска и руководителей ОМОНа необходимо было вызвать для дачи показаний. При этом выяснить, с какой целью они и их сотрудники там находились и перекрывали вход в здание А.Козулину и его доверенным лицам. Помните, в 1996 году в этом здании такая же ситуация была с В.Гончаром, С.Шарецким и Генеральным прокурором В.Капитаном, когда их также не пускала в Центризбирком группа неизвестных лиц. При этом милиция стояла в стороне и ничего не предпринимала. Все это говорит о том, что в стране есть секретные службы, которые по статусу стоят выше сотрудников МВД, которые действуют без оглядки на законы и Конституцию. Я думаю, если бы эти ребята стали избивать у них на глазах А.Козулина и его доверенных лиц, то они тоже не вмешались бы.

— Следствие установило личности хулиганов, которых Вы с Козулиным сдали в милицию?

— Во время дачи мной объяснений в кабинет зашел кто-то из работников милиции и сказал, что задержанные дали неправильные сведения о себе, и при мне назвал их ложные фамилии: Голованов и Сотников. Сотрудник милиции заметил, что у них при себе не было каких-либо удостоверяющих личность документов.

Впоследствии нам удалось узнать, что работники милиции, записав фамилии задержанных лиц (с их слов), отпустили их в нарушение норм уголовно-процессуального законодательства.

Следователь прокуратуры Г.В.Поцейкович не стал устанавливать личности напарников Якимовича, хотя для этого не требовалось больших усилий. Надо было лишь допросить дежурных офицеров, которые бы рассказали, как из помещения закрытого учреждения милиции из-под охраны нескольких вооруженных милиционеров "испарились" "Сотников" и "Голованов". Можно только догадываться, чиновники какого ранга приезжали вечером в отделение милиции, если задержанные были незаконно отпущены. Но следствие этот факт не расследовало.

— Как Вы думаете, а каким образом образовалась гематома у Якимовича? Если не Козулин, то кто ее мог причинить?

— Я уже говорил, что Якимович обратился в милицию только через три часа. Этого времени хватило бы не только для того, чтобы составить "правильные" показания, но и для того, чтобы искусственно сделать себе телесные повреждения для оправдания своих противоправных действий. Где Якимович находился три часа до "скорой помощи"? Может, занимался боксом в спортивном зале? Или поскользнулся в душевой кабине и упал?

Эти факты только опровергают показания Якимовича, Гаевского и Щербакова. Даже если начальство направило их туда, чтобы они следили за порядком, кто мешал им представиться представителю администрации, который там находился, и не скрывать этого? Но на самом деле выяснилось, что ни Цыбулько, ни Мазаник, ни Вачинский, ни Салженикин, никто, даже и А.Козулин не знают, что это, оказывается, сотрудники милиции.

Считаю, что действия Якимовича и его коллег никоим образом нельзя квалифицировать как действия работников милиции, пресекавших хулиганские действия. На тот момент они не были работниками милиции. А Якимович задержан был мною и А.Козулиным как хулиган, который применил против меня слезоточивый газ, поэтому его и его напарников необходимо привлечь к уголовной ответственности за хулиганство.

— Скажите, может ли быть такое, что на следователя оказали давление "сверху", чтобы он не устанавливал организаторов и участников спецгруппы, спровоцировавших конфликт с кандидатом в президенты А.Козулиным и группой журналистов?

— Конечно, я допускаю такую возможность, поскольку я сам работал в прокуратуре, и, кстати, на должности старшего следователя, и могу сказать, что могло быть такое давление. Но у нас есть закон, и прокурор должен его защищать. Если бы следователь Г.В.Поцейкович при рассмотрении моей жалобы и жалобы кандидата в президенты Республики Беларусь А.В.Козулина проявил объективность, принципиальность и просто смелость, он бы установил, что в Беларуси в момент выборов действовали незаконные спецподразделения, целью которых являлось саботирование и срыв всей предвыборной кампании в стране. И я больше чем уверен, дело А.Козулина не дошло бы до суда.

— Ранее власти сообщали, что А.Козулину была запрещена пресс-конференция, а поэтому действия администрации пресс-центра по недопущению кандидата в президенты в здание были правомерными.

— В ходе суда над А.Козулиным было установлено, что действия администрации Национального пресс-центра по запрету Козулину провести пресс-конференцию были незаконны. Защитники А.Козулина смогли доказать, что для прохода в здание не надо предъявлять каких-либо дополнительных документов и пояснять, с какой целью гражданин идет туда.

Я считаю, что эти незаконные действия администрации ГУ "Национальный пресс-центр Республики Беларусь" в лице Соколовского, его заместителя Цыбулько, а также заместителя директора ГУ "Республиканский культурно-просветительский центр" Мазаника самовольно, в нарушение должностных обязанностей ограничили доступ посетителей в здание в рабочее время. Мало того, они, в соответствии с Избирательным Кодексом (ст.74), были обязаны содействовать организации встреч кандидата в президенты Беларуси с избирателями и журналистами. Соколовский и его заместитель Цыбулько своим решением спровоцировали конфликтную ситуацию. Поэтому вся ответственность за срыв работы данного предприятия лежит на самой администрации, которая незаконно до окончания рабочего времени распустила сотрудников и приняла незаконное решение перекрыть вход, причем, еще раз подчеркну, избирательно, в отношении только кандидата в президенты А.В.Козулина и его инициативной группы.

Установив это обстоятельство, следствие обязано было возбудить уголовное дело против должностных лиц ГУ РКПЦ И.В.Соколовского, А.Г.Цыбулько, В.В.Мазаника, И.А.Салженикина, С.А.Вачинского по ч.1 ст.426, ч.2.ст.191 УК РБ за превышение своих служебных полномочий. В своей жалобе я прошу прокурора, чтобы он возбудил уголовное дело против указанных должностных лиц.

— Верите ли Вы в справедливое рассмотрение Вашей жалобы?

— В следственной и судебной практике Беларуси создан прецедент, когда впервые законные требования кандидата в президенты преследуются в уголовном порядке и ложатся в основу уголовного дела. Я лично присутствовал на месте событий, являюсь, по сути, пострадавшей стороной и как бывший следователь прокуратуры способен дать адекватную и юридическую оценку происшедшему. Я рассматриваю свою жалобу как документ, подробно описывающий один из эпизодов, положенных в основу обвинения кандидата в президенты А.Козулина, и нахожу его достоянием истории, к которому не раз будут обращаться не только историки, но и в первую очередь граждане, находящиеся на службе у закона, справедливости и совести. Нет ничего более постоянного, чем временное, и я знаю, что когда-нибудь этот документ послужит еще одним аргументом в доказательной базе по делу о полном оправдании А.Козулина, снятия с него судимости и о наказании виновных, преступивших нормы права, этики и морали, прямо или косвенно участвующих в этом судилище народного лидера.

Но где-то в глубине души у меня есть надежда, что прокурор сделает все возможное, чтобы Якимович и все причастные к этому эпизоду стали обвиняемыми, и тем самым докажет, что в нашей стране есть принципиальные прокурорские работники, которые стоят на защите законности и правопорядка. Через год после решения прокурора А.К.Стука о возбуждении уголовного дела в отношении А.Козулина у него есть шанс освободить невиновного человека, который незаконно, по сфабрикованному делу, осужден к лишению свободы на пять с половиной лет. И это будет настоящий мужской поступок.

Ясно одно: случившееся 17 февраля 2006 года было целенаправленной акцией с целью помешать кандидату в президенты Республики Беларусь А.Козулину полноценно проводить предвыборную кампанию.

Дарья ЦЫВАНЧИК.

Вот эти два человека — один в зимней шапке, руки в карманах, другой — в кепке, правая рука в кармане — координировали действия А.Якимовича и его напарников. Неужели прокуратуре так трудно найти их и дать правовую оценку их деятельности? Может, читатели помогут прокуратуре это сделать? Если кому-нибудь известны эти люди, если кто знает, где они работают, проживают, — сообщите, пожалуйста.

Судя по материалам дела, у А.Якимовича под левым глазом гематома размером 3х8 сантиметров. На снимке, сделанном уже после стычки, ничего не видно.

А.Якимович по приезде милиции скрылся. А.Козулину и О.Волчеку удалось задержать этих двоих "в вязаных шапочках". Но, не установив личности, милиция почему-то отпустила их. Кстати, более четкое изображение лица одного из них — на снимке ниже.

И еще одного "героя" не может найти прокуратура — на снимке видно его лицо за спиной А.Козулина.

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ...

Што за фрукт такі?

Якую незалежную газету ні адкрыеш — усюды пішуць пра Палітсавет Аб'яднаных дэмакратычных сіл. Можа, хоць вы патлумачыце, што гэта за фрукт такі — Палітсавет, хто ўваходзіць туды і чым гэтая структура займаецца?

Анатоль Вераценнікаў, Мінск.

Палітсавет Аб'яднаных дэмакратычных сіл быў створаны на Кангрэсе дэмакратычных сіл у 2005 годзе для каардынацыі дзейнасці ўсіх структур дэмакратычнага накірунку. Узначальвае Палітсавет Аляксандр Мілінкевіч. У Палітсавет уваходзяць 12 палітычных суб'ектаў, хаця шэраг з іх не маюць афіцыйнай рэгістрацыі ў Міністэрстве юстыцыі. Калі лічыць па галовах, то Палітсавет — гэта 14 чалавек: лідэры Партыі камуністаў Беларускай Сяргей Калякін, Партыі БНФ Вінцук Вячорка, АГП Анатоль Лябедзька, БСДП (Грамада) Анатоль Ляўковіч, Партыі жанчын "Надзея" Алена Яськова, БСДГ Станіслаў Шушкевіч, Аляксандр Мілінкевіч, ягоны бліжэйшы паплечнік, які прадстаўляе аргкамітэт стварэмага руху "За свабоду!" Віктар Карняенка, старшыня экалагічнай партыі "Зялёных" Алег Грамыка з Гомеля, лідэры аргкамітэтаў па стварэнні Партыі працоўных Аляксандр Бухвостаў, Партыі прагрэсу і справядлівасці — Уладзімір Навасяд, БСДН (НГ) Міколы Статкевіча — Алесь Арэстовіч, незарэгістраванай арганізацыі "Малады фронт" — прыходзяць калі хто, а таксама Каардынацыйны савет прадпрымальнікаў на чале з Ігарам Леднікам.

На дадзены момант паступіла заява ад кіраўніка аргкамітэта стварэмага руху "За свабоднае развіццё прадпрымальніцтва" Віктара Гарбачова, які просіць уключыць у Палітсавет іх прадстаўніка. На адным з апошніх пасяджэнняў Анатоль Ляўковіч прапанаваў уключыць у склад Палітсавета Аляксандра Вайтовіча...

Ці аднолькавыя галасы ў Палітсавеце? Чаму стварэмы рух "За свабоду!" мае аж два галасы, а, напрыклад, Рада інтэлігенцыі — ніводнага? Па якім прынцыпе абіраць членаў Палітсавета? Пытанняў сапраўды шмат. Таму зараз узнікла ідэя яго рэфармавання.

Плануецца, што ў Палітсавеце будзе кіраўніцтва — прэзідыум, у які павінны ўвайсці толькі лідэры буйнейшых структур: ПКБ, АГП, Партыі БНФ, БСДП (Грамада).

Рашэнне аб рэфармаванні Палітсавета павінен зацвердзіць менавіта КДС.

Глеб ХМЯЛЬНІЦКІ.

ПАСЛЯСЛОЎЕ

Нечаканы паварот «справы пажарнікаў»

Сваякі асуджаных сцвярджаюць, што злачынная групоўка фактычна была створана сілавымі структурамі

Сваякі ўдзельнікаў гомельскай злачыннай групоўкі "пажарнікі" накіравалі скаргу ў Міжнародную асацыяцыю абароны правоў чалавека, а таксама ў Вярхоўны суд Беларусі, пракуратуру і Адміністрацыю прэзідэнта. Пра гэта паведамілі БелаПАН сваякі асуджаных.

Пад дакументам падпісаліся 16 чалавек — жонкі і бацькі асуджаных па справе "пажарнікаў" і падазроных у арганізацыі злачыннай групоўкі, якія цяпер знаходзяцца ў Расіі і чакаюць экстрадыцыі на радзіму.

У скарзе сваякі сцвярджаюць, што ў працэсе следства на іх мужоў і дзяцей аказваўся ціск з боку работнікаў праваахоўных органаў. Паводле слоў сваякоў, неправамерныя дзеянні работнікаў СІЗА і пракуратуры былі прычынай смерці падазронага Салаўёва, які скончыў жыццё самагубствам. Таксама жонкі і бацькі просяць перагляду ўсіх крымінальных спраў і правядзення адкрытых судоў.

Групоўка "пажарнікі" фактычна створана гомельскімі сілавымі структурамі, зазначаецца ў скарзе. *"Такім чынам праваахоўныя органы хочуць апраўдаць перад Мінскам і грамадскасцю сваю бяздзейнасць у адносінах да групоўкі Марозава, якая трымала ў страху ўвесь горад,* — патлумачылі сутнасць сваёй скаргі сваякі. — *Нашы хлопцы ў свой час адмовіліся плаціць даніну "марозаўцам", за што і пацярпелі. Пры дапамозе міліцыі іх у 1995 годзе вывозілі з горада і збівалі, каб прымусіць плаціць даніну. Сфабрыкаваць справу супраць "пажарнікаў" з паказанняў валютчыкаў, прастытутак і секараў мяса цяжкасці не склала — яны давалі паказанні супраць нашых хлопцаў і пасля самі ж ад іх адмаўляліся. Гэтая справа міліцыі патрэбна была для таго, каб кінуць хлопцаў за краты, каб яны не далі паказанняў на некаторых работнікаў праваахоўных органаў, пры дапамозе якіх у Гомелі дзейнічалі "марозаўцы". Таму і суды над нашымі хлопцамі былі закрытымі".*

Усяго па справе арганізаванай злачыннай групоўкі "пажарнікі" прайшло два судовыя працэсы і асуджаны 46 чалавек. Сямёра падазроных у арганізацыі групоўкі знаходзяцца ў Расіі і чакаюць экстрадыцыі ў Гомель. Групоўка была створана ў сярэдзіне 1990-х гадоў і праіснавала 10 гадоў.

Фаіна МЯРКУЛАВА.

«Зеніт» хоча падняцца з каленяў

Вілейскі оптыка-механічны завод "Зеніт" прапануе раённаму Савету дэпутатаў заняцца вырашэннем праблем прадпрыемства. Прафкам Свабоднага прафсаюза Беларускага перадаў старшыні райсавета Яўгену Ігнатовічу зварот, падмацаваны 145 подпісамі, з прапановай неадкладна прыступіць да ажыўлення завода.

145 рабочых Вілейскага завода "Зеніт" перадалі старшыні Вілейскага райсавета Яўгену Ігнатовічу калектыўны зварот. Заводская пярвічка Свабоднага прафсаюза патрабуе ўшчыльную заняцца вывадам прадпрыемства з крызісу.

"Зеніт" учарашні і сённяшні — усё роўна як неба і зямля. З пяці тысяч рабочых засталося толькі 1180 чалавек. *"Пагаршэнне матэрыяльнага становішча, ніякай перспектывы паляпшэння гэтага становішча, парушэнне Працоўнага кодэкса і Калектыўнай дамовы"*, — так коратка і ёміста характарызуюць сітуацыю 145 рабочых, якія не пабаяліся паставіць подпісы пад зваротам.

Напрыклад, працякае дах прадпрыемства, а гэта значыць, што кожную хвіліну любога рабочага за станком падпільноўвае смерць. Бо электрычнасць не церпіць падобных адносін да сябе. Аднак, як кажа старшыня прафкама СПБ Аляксандр Сыракваш, на латанне дзірак — у прамым, а не пераносным сэнсе — неабходны 1 мільярд 300 мільёнаў рублёў. Такіх грошай прадпрыемства не мае. І ў такіх умовах — штохвіліны чакаючы смерці — рабочыя працуюць не першы месяц.

Але пакуль нікога токам не забіла, найгалоўная праблема, зразумела, мізэрныя заробкі. На канец 2006 года рабочыя атрымлівалі толькі 370 тысяч рублёў. *"Дасюль нічога не змянілася, а цэны растуць ледзь не штодня"*, — адзначыў А.Сыракваш.

"Мы гатовы весці з уладамі канструктыўны дыялог па выхадзе з крызісу. Але многіх афіцыйных захадаў проста не разумеем. Так, нядаўна ў нас змяніўся дырэктар, аднак новы быў прызначаны з ліку людзей, якія знаходзяцца за рулём завода ўжо цягам дзесяцігоддзяў і ніяк сябе не праявілі на займаемых пасадах. На заводзе адсутнічае стратэгічная праграма развіцця. Мы жадаем яснасці ў перспектывах завода і планах мясцовай улады па вывадзе нашага прадпрыемства з крызісу", — гаворыцца ў звароце.

Аляксандр Сыракваш адзначае, што вілейскі "Зеніт" — горадаўтваральнае прадпрыемства. *"Гэта азначае, што "Зеніт" — галоўны кармілец горада з насельніцтвам 22—24 тысячы чалавек. Мы прапануем раённым уладам сесці за "круглы стол", і, калі выканаўчая ўлада не мае свайго плана вываду прадпрыемства з крызісу, гатовыя разам шукаць прымальнае рашэнне"*, — гаворыць А.Сыракваш.

Георгій ГЛЕБУСЬ.

За тых, хто не нарадзіўся

З 25 сакавіка парафіяне гомельскага касцёла Нараджэння Божай Маці пачалі малітвы за ненароджаных дзяцей, паведаміў БелаПАН настаяцель храма ксёндз Славамір Ляскоўскі. Акцыя праходзіць у касцёле ўжо трэці год.

"Чалавек, які жадае маліцца за ненароджаных дзяцей, запісваецца ў нас і атрымлівае лісток з тэкстам малітвы. Яе чытанне кожны праводзіць самастойна", — патлумачыў Славамір Ляскоўскі.

Акцыя будзе доўжыцца дзевяць месяцаў, да свята Божага Нараджэння.

Фаіна МЯРКУЛАВА.

Народная Воля http://www.nv-online.info
29 САКАВІКА 2007 г.

ДЫПКУР'ЕР

Нарэшце ў Мінску з'явіўся украінскі пасол

У Мінск прыбыў новы пасол Украіны ў Беларусі Ігар Ліхавы, ён ужо ўручыў копіі даверчых грамат міністру замежных спраў Сяргею Мартынаву. Дата ўручэння даверчых грамат Аляксандру Лукашэнку пакуль дакладна не вядома, зазначаюць ва ўкраінскай дыпламатычнай місіі.

Указ аб прызначэнні новага пасла прэзідэнт Украіны Віктар Ющчанка падпісаў 6 лютага 2007 года.

Паводле інфармацыі ўкраінскіх СМІ, І.Ліхавы нарадзіўся 12 чэрвеня 1957 года ў сяле Врубліўка Раманаўскага раёна Жытомірскай вобласці. З 1989-га па 2005 год кіраваў Канеўскім дзяржаўным музеем-запаведнікам Тараса Шаўчэнкі, а таксама займаў пасаду генеральнага дырэктара Шаўчэнкаўскага нацыянальнага запаведніка. З кастрычніка 2005-га па лістапад 2006 года быў міністрам культуры і турызму.

Таццяна КАРАВЯНКОВА.

ЧУЛІ?

Шахцёры пратэстуюць

Незалежны прафсаюз гарнякоў (НПГ) ВА "Беларуськалій" падаў заяўку на правядзенне 13 красавіка шэсця і мітынгу ў Салігорску.

Нагадаем, што раней Салігорскі гарвыканкам забараніў прафсаюзу "Беларуськалій" праводзіць пікет 14 сакавіка. Фармальнай падставай для забароны стала аб'яўленая ў Салігорску эпідэмія грыпу.

На акцыі актывісты прафсаюза маюць намер выказаць пратэст супраць пазбаўлення працоўных ільготных пенсій і запатрабаваць павелічэння зарплаты работнікам абагачальных фабрык "Беларуськалія" шляхам павышэння каэфіцыента аплаты працы. Шахцёры збіраюцца прайсці калонай ад будынка ўпраўлення "Беларуськалія" да цэнтральнай плошчы горада і правесці там мітынг.

Марына НОСАВА.

Лічыльнікі — усім пагалоўна

У Беларусі да канца 2008 года ва ўсіх кватэрах павінны быць усталяваны лічыльнікі вады. Пра гэта паведаміў начальнік упраўлення жыллёвай гаспадаркі Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Беларусі Эдмунд Грышкевіч.

Ён нагадаў, што такое даручэнне сёлета ў студзені было дадзена кіраўніком краіны. Па словах Грышкевіча, у цяперашні час у Беларусі эксплуатуецца больш за 2,5 млн кватэр, абсталяваных водаправодам. З іх лічыльнікі вады ўсталяваны ў больш як 800 тыс. кватэр.

Выдаткі на іх устаноўку складуць каля 350 млрд рублёў, агулам спатрэбіцца амаль 3,5 млн лічыльнікаў. Аднак пакуль не вырашаны пытанні фінансавання прац з прыцягненнем крэдытаў банкаў пад гарантыі мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, паведамляе БЕЛТА.

СКАНДАЛ

Уволен не по собственному желанию

Он вдруг стал профнепригоден. Актера высшей категории, режиссера, лауреата международных фестивалей и обладателя театральных премий Павла Харланчука уволили с работы. Официально — "в связи с несоответствием занимаемой должности". Но есть и другая сторона у этой истории.

В начале века театральный бомонд Беларуси заговорил о перспективном молодом актере и режиссере Павле Харланчуке. У него брали интервью, показывали в новостях на канале ОНТ, снимали в рекламах.

В 2000 году Павел Харланчук заканчивал актерский факультет Белорусской академии искусств. Работу талантливого юноши — постановку отрывка из спектакля "Господа Головлевы" — увидел режиссер Национального академического драматического театра имени Горького Борис Луценко. И сразу же принял Павла на третий курс отделения "режиссура драмы".

Через год Харланчук впервые вышел на сцену горьковского театра в роли Криспена в спектакле "Единственный наследник". А в 2003 году состоялся его режиссерский дебют — детская сказка "Джельсомино в Стране лгунов". А дальше, как по спирали, — одна удача за другой.

В том же 2003 году молодой режиссер выиграл грант Министерства культуры Беларуси на постановку спектакля "Детектор лжи". В 2004 году талантливому актеру и режиссеру вручали президентскую стипендию. В 2005-м — после блестящего исполнения роли Мозглякова в спектакле "Дядюшкин сон" присвоили высшую актерскую категорию...

А потом в Беларуси случились президентские выборы. 19 марта 2006 года Павел Харланчук был на Октябрьской площади. И практически каждый день приходил к протестующей молодежи, разбившей на главной площади страны палаточный лагерь. Был там Павел и в ночь разгона лагеря, когда крепкие спецназовцы заталкивали молодых людей в машины, следующие по привычному в те дни маршруту — в спецприемник-распределитель на Окрестина.

